# Культура Беларусі XVI стагоддзя



Беларусь XVI ст. напоўніцу адчула сваю місію сярод іншых народаў. Суседзі спазналі ўплыў галоўнага беларускага абуджэння ў культуры, гаспадарцы, палітыцы, рэлігіі.

Беларусь канчаткова сфармавалася як сэрца Еўропы – сэрца любові, болю і веры.

XVI ст. – гэта дзеі апосталаў нацыі. Францыск Скарына і Леў Сапега, Мікалай Радзівіл і Астафі Валовіч, Мікола Гусоўскі і Андрэй Волян, Сымон Будны і Іпаці Пацей , Кастусь Астроускі і Пётра Скарга, Іван Федаровіч ды Пётр Мсціславец. Імёны, напісаныя ў нашай гісторыі вялікімі літарамі.





XVI ст. – фаервэрк кнігадрукавання і культуры. Дзясяткі выданняў Святога Пісьма, катэхізмаў, тэалягічнае публіцыстыкі і навучальнай літаратуры. "Песня пра зубра", "Пруская вай на", знакамітыя летапісы. Сармацкі партрэт, Мірскі замак, першае ва Ўсходняй  Еўропе барока ў Нясвіжскім касцёле Божага Цела, якое ў наступных стагоддзях  цэлы выбух шэдэўраў. Мураванка, Сынкавічы, збор у Заслаўі, Фара ў Горадні. Сотні адчыненых школаў – кальвінскія, езуіцкія, брацкія. Віленская Акадэмія... Перабіраеш, зачэрпваеш жменямі, не раўнуючы як залатыя скарбы ў куфры – з агністым бляскам, звонам і немым захапленьнем!



# Мірскі замак




У XVI стагоддзі

XVI ст. – залатая эпоха, калі на беларускай мове ліставаліся дыпляматы Польшчы, Маскоўшчыны, Валахіі, Малдовы, калі знакамітыя Генрыкаўскія артыкулы прымусілі Францыю спыніць перасьлед гугенотаў пасля кашмару Варфаламееўскае начы.

Нарэшце, XVI ст. – гэта век геапалітычнага супрацьстаяньня з Масквой , змаганьня з агрэсіўнай Турэччынай , Люблінскай вуніі з Польшчай ; век перамогаў пад Клецкам, Воршай ды Улай . Беларусь – у эпіцэнтры жыцьця кантынэнту; Беларусь паўсюль – на вагу золата.

Эра навялікшага росквіту Беларусі, час галоўных герояў гісторыі і самага моцнага духоунага абуджэння – XVI стагоддзе.

